УДК 947.6.01

Д. В. Віцько, аспірант

# БУЙНОЕ МАГНАЦКАЕ І ДЗЯРЖАЎНАЕ ЗЕМЛЕЎЛАДАННЕ Ў АРШАНСКІМ ПАВЕЦЕ Ў КАНЦЫ XVII – ПАЧАТКУ XVIII ст.

This article deals with the situation in the sphere of large-scale magnate and state land ownership in Orsha region in the late XVII^th^ – early XVIII^th^ century. This region is characterized by high percentage of large-scale magnate ownership in general structure of land ownership. In the late XVII^th^ century the Sapiegas owned the largest acres. Their increase entailed acute conflicts with other magnate houses. Relations in this field were of a tense character and became one of the reasons of the civil war in the Grand Duchy of Lithuania at the end of the XVII^th^ century. In this conflict the gentry of Orsha supported the group of the republicans, even some lessees of their acres in Orsha region fought against the Sapiegas. After the Sapiegas were defeated in the battle near Alkeniki in 1700, their acres in the Grand Duchy of Lithuania were confiscated.

**Уводзіны.** Аршанскі павет Віцебскага ваяводства традыцыйна вылучаўся высокай удзельнай вагой буйной феадальнай уласнасці ў агульнай структуры землеўладання. Побач з Наваградскім паветам, дзе на працягу XVII ст. дамінавалі Радзівілы, ён уяўляе сабой наглядны прыклад канцэнтрацыі вялізных зямельных уладанняў у руках аднаго магнацкага роду – Сапегаў. Абодва паветы ўваходзілі ў лік найбуйнейшых у ВКЛ. На прыкладзе Аршанскага цікава будзе прасачыць, як падобнае дамінаванне ўплывала на палітычную сітуацыю на мясцовым і агульнадзяржаўным узроўнях.

Эканамічнае развіццё ўсходняга рэгіёну Беларусі і раней прыцягвала ўвагу гісторыкаў, пра што сведчаць працы В. І. Мялешкі, М. Тапольскай і І. Бараноўскага [1, 2]. Аднак эканамічнае развіццё рэгіёну разглядалася без сувязі з тымі працэсамі, якія мелі месца ў палітычнай сферы. Да таго ж сітуацыя з буйным землеўладаннем, якая склалася ў Аршанскім павеце на мяжы XVII–XVIII стст., па нейкіх прычынах разгледжана не была. Між тым на эканамічныя асновы дамінавання ў палітычным жыцці ВКЛ у канцы XVII ст. магнацкага роду Сапегаў слушна звярнуў увагу вядомы польскі даследчык А. Рахуба [3, с. 223–225]. Важна адзначыць, што большасць маёнткаў Сапегаў была сканцэнтравана менавіта ў Аршанскім павеце.

**Асноўная частка.** Увогуле, калі размова ідзе пра структуру зямельнай уласнасці феадальнага грамадства, то агульнапрынятым лічыцца яе падзел на дзяржаўную, царкоўную і прыватную ўласнаць феадалаў. Царкоўныя маёнткі ў гэты час у Аршанскім павеце былі пераважна сярэдніх памераў (да 100 дымоў) і на агульную сітуацыю з землеўладаннем уплывалі толькі ў нязначнай ступені. Што тычыцца дзяржаўнай уласнасці, то В. І. Мялешка выдзяляе такія яе віды, як эканомія, староства, дзяржава [1, с. 116–118]. Эканоміі падзяляліся на градовыя, якія існавалі пры ваяводскіх і павятовых гарадах і прызначаліся ваяводам у якасці «кармлення» за іх службу, і на сталовыя, прыбыткі ад іх прызначаліся для каралеўскага стала.

У Аршанскім павеце знаходзілася толькі адна, але вельмі вялікая сталовая эканомія, – Магілёўская. У 1671 г. у ёй налічвалася 4197 двароў, у 1742 г. – 3790 [1, с. 121]. Сталовыя эканоміі кіраваліся непасрэдна каралеўскай адміністрацыяй, і кароль не мог самастойна, без згоды сойму, перадаваць іх каму-небудзь. Аднак гэта норма парушалася. Так, пэўная частка Магілёўскай эканоміі пастаянна знаходзілася ў трыманні шляхты, а часам яна здавалася некаторым магнатам наогул уся цалкам, што пад канец XVII ст. ператварылася ў норму. З 1696 па 1700 г. гаспадары эканоміі змяняліся літаральна кожны год. Паводле «Магілёўскай хронікі», эканомію і замак у Магілёве, дзе размяшчалася адміністрацыя, пасля смерці караля Яна Сабескага заняў на паўтара гады Бенядзікт Павел Сапега. Затым на кароткі час яго змянілі Валовічы і Пацы. Потым зноў адбылося вяртанне Сапегаў, якія пакінулі там свайго адміністратара – Перуту. Апошні быў выгнаны з Магілёва саксонцамі на чале з генералам дэ Беўстам, якога даслаў Аўгуст II. У якасці эканома быў прызначаны Глэмбоцкі, пазней яго месца занялі саксонскія яўрэі Бейман і Лейман – крэдыторы Аўгуста II [4, с. 250–251]. У 1702 г. магілёўскую эканомію атрымаў ад караля ноўгарад-северскі харужы Крыштап Казімір Сяніцкі. Акрамя таго, землі эканоміі арандавала каля двух соцен дробных шляхціцаў (т. з. «данатарыюшы»). Яны ўтваралі асобную харугву, якая ўваходзіла ў склад павятовага паспалітага рушэння ў дадатак да трох іншых шляхецкіх харугваў [5, арк. 1087–1089]. «Данатарыюшы» праводзілі свае з'езды ў Магілёве. Частка з іх брала ў арэнду проста пустыя валокі, без падданых. 29 чэрвеня 1702 г. у Чавусах адбыўся з'езд такой маламаёмаснай шляхты, незадаволенай тым, што яна вымушана плаціць падаткі нараўне з тымі, хто мае падданых. На з'здзе было выра-шана «іх міласцяў паноў данатарыюшаў адступіўшы», абраць сабе за ротмістра рэчыцкага падчашага Міхала Казіміра Петуха, які за асобную плату павінен быў адстойваць інтарэсы шляхты [5, арк. 1091–1091 адв.].

Староствы таксама былі двух відаў: градовыя і неградовыя. У першым выпадку староста выконваў пэўныя судовыя функцыі (узначальваў павятовы гродскі суд). У другім выпадку староста («дзяржаўца») ніякіх судовых паўнамоцтваў не меў, а выконваў толькі адміністрацыйныя функцыі. Як правіла, на яго карысць выконваліся паншчына і дзякла; да таго ж староста займаўся зборам з падуладнага яму насельніцтва дзяржаўных падаткаў. У адрозненне ад эканоміі, староствы ўвесь час знаходзіліся ў руках розных асобаў за ¼ прыбытку (т. зв. «кварта») [1, с. 117]. Дробнае неградовые староства часцей за ўсё выступае пад назвай «дзяржава». Раздача маёнткаў, што належалі да староства, у трыманне (пасэсію) шляхце было дзейсным інструментам пашырэння палітычнага ўплыву ў павеце таго ці іншага магнацкага роду. Выбудоўвалася своеасаблівая шматузроўневая структура валодання дзяржаўнымі маёнткамі («каралеўшчынамі») па прынцыпу «дзяржава – староста – пасэсары». Прычым апошнія ў большасці выпадкаў папаўнялі шэрагі кліентаў таго магната, які з'яўляўся старостам. Формы трымання дзяржаўных, зрэшты, як і прыватных магнацкіх зямель, маглі быць самыя розныя: лен, заклад («застава»), арэнда, пажыццёвае («дажывотнае») трыманне і інш.

Найбуйнейшымі неградовымі староствамі ў Аршанскім павеце былі Барысаўскае і Любашанскае. Першым да 1685 г. валодаў вялікі гетман Казімір Ян Сапега, пазней – полацкі ваявода Дамінік Міхал Слушка. Любашанскае староства знаходзілася да 1693 г. ва ўладанні Міхала Сясіцкага, затым у Бенядзікта Паўла Сапегі, які перадаў яго ў 1699 г. сыну Міхалу [6, с. 354, 373].

Сярод прыватных феадальных маёнткаў ў канцы XVII ст. на першым месцы паводле агульнай колькасці дымоў знаходзіліся ўладанні Сапегаў, наймагутнейшага на той час у ВКЛ магнацкага роду. Панаванне Сапегаў на палітычнай арэне Вялікага княства пачалося фактычна з 1682 г., калі Казімір Ян, сын Паўла Яна Сапегі, стаў вялікім гетманам. Яго брат Бенядзікт Павел на той момант з'яўляўся падскарбіем ВКЛ. Шэраг драбнейшых пасадаў займалі іх сыны (стольніка, канюшага, вялікага маршалка і польнага пісара).

Сапегам належалі вялізныя зямельныя ўладанні ў розных паветах княства. У Аршанскім павеце вялікі гетман Казімір Сапега меў спачатку толькі Стары Быхаў, які атрымаў у спадчыну ад бацькі. Затым, у 1685 г., ён купіў у Дамініка Міхала Слушкі таксама Новы Быхаў (саступіўшы барысаўскае староства). Яго першая жонка Крысціна Барбара з Глябовічаў унесла яму ў 1667 г. немалы пасаг, у тым ліку Дуброўна ў Аршанскім павеце [6, с. 354]. Шлюб стольніка ВКЛ Юрыя Станіслава Сапегі, старэйшага сына вялікага гетмана, з Ізабелай Палубінскай у 1685 г. дадаў да сапежынскіх уладанняў Горы і Горкі, Баркалабава, Буйнічы і Дашкоўку [6, с. 77]. Аснову ўладанняў Бенядзікта Паўла Сапегі ў павеце і наогул у ВКЛ складала Чарэя з Мялешкавічамі і Бабром [7, с. 51]. Таксама варта сюды дадаць Беліцу – уладанне Ганны Барбары, маці Казіміра і Бенядзікта Сапегаў. У сярэднім па павеце, паводле падлікаў Г. Слесарунаса, Сапегам належала 39 % усіх сялянскіх двароў [7, с. 63]. А ўвогуле па ВКЛ уладанні Сапегаў налічвалі каля 30 тыс. дымоў (10 % ад агульнай колькасці дымоў княства) і пераўзыходзілі не толькі маёнткі ўсіх тагачасных магнацкіх родаў, але і маёнткі ўсіх найбагацейшых магнатаў за два папярэднія стагоддзі.

Аднак паралельна з павелічэннем уладанняў Сапегаў ішло таксама пашырэнне кола іх асабістых ворагаў, паколькі набыццё тых ці іншых маёнткаў часта азначала, што ўсе прэтэнзіі да іх з боку іншых родаў будуць з гэтага моманту адрасаваныя непасрэдна ім. Так, на куплены ад Слушкаў Новы Быхаў з Тайманавам прэтэндаваў полацкі кашталян Міхал Пац [5, арк. 790], на спадчыну па Палубінскіх (Баркалабава, Буйнічы і Дашкоўку) – Сімяон Друцкі-Любецкі [5, арк. 129], да другой часткі гэтай латыфундыі (Горы і Горкі) меў прэтэнзіі канцлер Дамінік Мікалай Радзівіл [6, с. 355]. Але, бадай, самай вострай і доўгатрывалай была спрэчка Казіміра Яна Сапегі з Агінскімі і Пацеямі за права валодання Дуброўнай.

У сярэдзіне XVII ст. Дуброўна належала да ўладанняў віленскага ваяводы Юрыя Караля Глябовіча, пасля смерці якога ў 1669 г. перайшла да яго дачкі Марцыбелы Ганны, жонкі канцлера ВКЛ Марцыяна Аляксандра Агінскага. Пасля смерці ў 1681 г. Марцыбелы Агінскай Дуброўна была перададзена яе сястры Крысціне, жонцы на той час Казіміра Яна Сапегі [8, с. 620]. Марцыян Агінскі, аднак, не прызнаў такога рашэння і доўгі час судзіўся па гэтаму поваду з Сапегамі. Нарэшце, паводле чарговай дамовы ад 19 студзеня 1683 г. Дуброўна была падзелена. Пасля смерці ў 1690 г. бяздзетнага Марцыяна Агінскага галоўныя правы на атрыманне ў спадчыну яго ўладанняў пераходзяць да Казіміра Яна Сапегі. Аднак правы на частку Дуброўны атрымала таксама дваюрадная сястра канцлера Рэгіна Людвіка з Агінскіх і яе муж віцебскі ваявода Леанард Габрыэль Пацей [9, с. 37]. Іх сыны Людвік Канстанцін Пацей, стражнік ВКЛ з 1698 г., і Казімір Аляксандр, віцебскі кашталян з 1700 г., зноў выставілі прэтэнзіі на валоданне ўсёй Дуброўнай [10, с. 45].

Гэтая і іншыя спрэчкі выразна дэманструюць, дзе на самай справе трэба шукаць вытокі таго ўпартага супрацьстаяння паміж рознымі магнацкімі групоўкамі ў ВКЛ, якое ў канцы XVII ст. перарасло ў грамадзянскую вайну.

Табліца

**Буйное магнацкае землеўладанне ў Аршанскім павеце (кан. XVII – пач. XVIII ст.)**

| Маёнткі | Уладальнік | Дымы* | | |
|---|---|---|---|---|
| | | 1690 г. | 1701 г. | 1717 г. |
| Чарэя з Мялешкавічамі і Бабром | Бенядзікт Павел Сапега | 2316 | 2463 | 2450 |
| Дуброўна | Казімір Ян Сапега | 897 (2503) | 897 | 897 |
| Стары Быхаў | Казімір Ян Сапега | 697 (1417) | – | 697 |
| Новы Быхаў | Казімір Ян Сапега | 216 (412) | – | 200 |
| Горы і Горкі | Юры Станіслаў Сапега | 1200 | 1487 | 1100 |
| Баркалабава, Дашкоўка і Буйнічы | Юры Станіслаў Сапега | 250 | 250 | 200 |
| Беліца з Ульянавічамі | Ганна Барбара Сапега | 233 | – | 40 |
| Копысь | «нойбургскі» | 743 (1069) | 743 | 674 |
| Раманаў | «нойбургскі» | 130 | 106 | 108 |
| Шклоў, Гарадзішча і інш. | Адам Сяняўскі | – | 674 | 633(+18?) |
| Галоўчын | Язэп Багуслаў Слушка | – | 262 | 230 |
| Смаляны, Рэпухава, Палоннае | Павел Караль Сангушка | – | 204 | 153 |
| Крупкі, Абольцы і Няклюдава | Казімір Антоні Сангушка | – | 103 | 48 |
| Бялынічы і інш. | Казімір Агінскі | – | 243 | 162 |
| Круглае, Стараселле, Цяцерын і інш. | Казімір Агінскі | – | 160 | 145(+15?) |
| Халапенічы, Красналукі, Траянаўка | Халецкія | – | 112 | 84 |

* Улічаны толькі маёнткі звыш 100 дымоў. Прыведзеныя лічбы адлюстроўваюць намінальную колькасць дымоў, з якіх выплочваліся падаткі. Для параўнання ў дужках дадзена рэальная колькасць дымоў у асобных сапежынскіх (на 1690 г.) уладаннях і Копысі (на 1694 г.). Аснова для складання табліцы: «Regestra perceptowe uchwalonego Laudum Generalnego pod Olkinikami» (1701 г.) [5, арк. 1508–1511], «Taryfa abjuratowa» Аршанскага павету (1717 г.) [16], зарэгістраваныя Сапегамі дымы па сваіх аршанскіх уладаннях у рэестры падымнага Слонімскага павету (1690 г.) [17], а таксама дадзеныя Г. Слесарунаса [7], Е. Можы [18], В. І. Мялешкі [1].

Акрамя Сапегаў, значныя па плошчы і колькасці падданых уладанні знаходзіліся таксама ў руках Агінскіх, Сангушкаў, Слушкаў, Халецкіх і Сяняўскіх (гл. табліцу).

Пералік канфліктаў за права валодання тымі ці іншымі маёнткамі быў бы няпоўны без узгадкі пра т. зв. «нойбургскае пытанне» – спрэчку за права апекі, а затым і валодання землямі слуцкіх Радзівілаў, якія засталіся пасля смерці канюшага ВКЛ Багуслава Радзівіла і належалі яго дачцы Людвіцы Караліне, жонцы Карла Філіпа Нойбургскага [14, с. 121]. Апрача Случчыны сюды ўваходзіла вялікая колькасць дастаткова буйных маёнткаў у розных кутках княства. Пасля смерці ў 1695 г. Людвікі Караліны увесь гэты вялізны комплекс уладанняў (больш за 14 тыс. дымоў) пераходзіць у спадчыну да яе малалетняй дачкі Альжбеты Аўгусты. Апекуном гэтых маёнткаў Трыбунал ВКЛ прызнаў Казіміра Яна Сапегу. Адначасова свае прэтэнзіі выставілі прадстаўнікі нясвіжскай галіны Радзівілаў – канцлер Дамінік Мікалай і падканцлер Караль Станіслаў. Нарэшце, 24 чэрвеня 1700 г. Казімір Ян Сапега заключае дамову з Карлам Філіпам, паводле якой набывае адразу ўсе «нойбургскія ўладанні» у сваю прыватную ўласнасць [6, с. 355], парушаючы тым самым апякунскую дамову. У Аршанскім павеце да «нойбургскіх уладанняў» адносіліся Копысь і Раманаў, а таксама частка Свіслацкай воласці (са складу слуцкіх зямель). У другой палове 1700 г. Сапегі пачынаюць з дапамогай сілы зганяць са сваіх месцаў трымальнікаў асобных «нойбургскіх» маёнткаў і нават ранейшых адміністратараў гэтых зямель. Асаблівую актыўнасць у гэтай справе праяўлялі сыны вялікага гетмана. Так, 24 верасня 1700 г. Юрый Станіслаў Сапега захапіў Копысь [15, с. 292]. У 1701 г. капыскі адміністратар Андрэй Рыгор Аборскі адзначаў падчас выплаты падаткаў, што «графства Капыскае моцна спустошана ў выніку нападу вяльможнага яго міласці пана стольніка ВКЛ праз здабыванне штурмам, зруйнаванне горада і спусташэнне воласці» [5, арк. 1510]. Парушэнне Сапегамі апякунскай дамовы прывяло да таго, што адміністрацыя «нойбургскіх уладанняў», на чале якой стаяў калішскі падчашы Станіслаў Незабітоўскі, схіляецца да супрацоўніцтва з Радзівіламі.

Алькеніцкая пастанова, прынятая 24 лістапада 1700 г., абвясціла Казіміра Яна і Бенядзікта Паўла Сапегаў, а таксама іх сыноў «ворагамі, пазбаўленымі гонару, асуджананымі на выгнанне»; у іх адбіраліся «тытулы, пасады, староствы ўсе і дзяржавы», а ўладанні падлягалі канфіскацыі [16, k. E]. Гэта рэзка змяніла сітуацыю з буйным магнацкім землеўладаннем як у Аршанскім павеце, так і ў іншых ваяводствах і паветах ВКЛ. Канфіскаваныя маёнткі былі прызначаныя для размяшчэння войска ВКЛ («рэспубліканскага») і былі перададзеныя «у трыманне ад імя Рэчы Паспалітай» генеральнаму палкоўніку Міхалу Вішнявецкаму. Апошні павінен быў паставіць там сваіх адміністратараў,

якія, ў сваю чаргу, абавязваліся трымаць справаздачу перад камісарамі, прызначанымі на Алькеніцкім з'ездзе. Асобам, якія мелі да Сапегаў нейкія прэтэнзіі, дазвалялася звяртацца ў Трыбунал ВКЛ, дзе яны маглі быць задаволеныя за кошт канфіскаваных уладанняў. Паколькі недахопу ў жадаючых пажывіцца чужой уласнасцю не было, то ў хуткім часе пачаўся «вялікі разбор» сапежынскіх маёнткаў. «Нойбургскія ўладанні» пастанова перадавала пад апеку канцлера ВКЛ Караля Станіслава Радзівіла, прычым ён не павінен быў заключаць з Карлам Філіпам Нойбургскім кантракт, аналагічны сапежынскаму, і набываць іх у прыватную ўласнасць. У маёнтках павінны былі гаспадарыць ранейшыя адміністратары (так, Копысь быў вернуты назад Аборскаму), а ў фартэцыях знаходзіцца «рэспубліканскія» гарнізоны [16, k. $F_2$]. Зрэшты, галоўны эканом усіх гэтых зямель Станіслаў Незабітоўскі не быў такім ужо безкарыслівым іх абаронцам, як можа падацца на першы погляд. Не забываўся ён і пра сябе. Так, у 1702 г., на моцы пагаднення з Карлам Філіпам, Незабітоўскі атрымаў ў асабістую ўласнасць Свіслач з Бацэвічамі [5, арк. 735], якімі з 1695 г. валодаў на правах лена.

У Аршанскім павеце падлягалі канфіскацыі ўсе ўладанні Сапегаў без выключэння. «Рэспубліканцы» прынялі захады, каб устанавіць сваю ўладу у Дуброўне, Баракалабаве, Горах і Горках, Старым і Новым Быхаве. Аднак самы цяжкі лёс выпаў, відаць, на долю Чарэі, якая належала Бенядзікту Паўлу Сапегу. У якасці пакарання за мытныя махінацыі падскарбія яго землі пераходзілі ў іпатэку да скарбу ВКЛ. Гэта азначала, што камісары, выпраўленыя Вішнявецкім, павінны былі выбраць там падаткаў на суму 300 тыс. злотых. Акрамя таго, Алькеніцкая пастанова прызнала слушнымі прэтэнзіі да Сапегі з боку Пацеяў, Агінскіх, Валовічаў, Коцелаў, Ромераў, Акольскіх, Лукомскіх і іншых, якія павінны былі быць задаволеныя «вёскамі падданых» з чарэйскіх уладанняў [16, k. $F_3$].

Аднак на практыцы рэалізацыя гэтых рашэнняў натрапіла на сур'ёзныя перашкоды. Спачатку «рэспубліканцам» удалося на кароткі, як высветлілася, час апанаваць амаль ўсе сапежынскія ўладанні ў павеце, за выключэннем Старога Быхава з яго магутнай фартэцыяй. Аднак размяшчэнне там войска, вымаганне велізарных сумаў, гвалты і рабункі выклікалі рэзкае незадавальненне з боку былых сапежынскіх падданых. У выніку вясною 1701 г. у Аршанскім павеце выбухнула беспрэцэдэнтнае па размаху сялянскае паўстанне, на падаўленне якога «рэспубліканцы» страцілі паўтара гады. Сапежынскія сяляне і наёмныя атрады занялі Горкі, Дуброўна, Баркалабава і Новы Быхаў.

Адначасова Сапегі прадпрынялі яшчэ адзін нестандартны ход з мэтай захавання, прынамсі, часткі сваіх уладанняў. Жонкі магнатаў падалі ў Трыбунал ВКЛ скаргі на сваіх мужоў з мэтай «адсудзіць» у іх тыя землі, якія яны ўнеслі ім ў якасці пасагу. Зрэшты, тагачаснае права ім і так гэта гарантавала. Аднак у «рэспубліканцаў» былі свае ўяўленні на гэты конт, а стаўленне іх да выканання прававых нормаў часта пакідала жадаць лепшага. Так, на момант разгляду скаргі у Горацкім графстве гаспадарылі ўжо адміністратары «Рэчы Паспалітай»: Жыгімонт Ганусевіч Пяшкевіч, Міхал Дубейкаўскі і Міхал Заблоцкі [5, арк. 278]. У выніку Ізабела Сапега без асаблівай цяжкасці здолела даказаць, што Горы, Горкі, Баркалабава, Буйнічы, Дашкоўка і іншыя маёнткі перайшлі ёй у спадчыну пасля бацькі Аляксандра Гілярыя Палубінскага, маршалка ВКЛ, і братоў. У канцы красавіка 1701 г. Горы і Горкі ёй былі вернуты, праўда, у жахлівым спустошаным стане [5, арк. 245, 277–280].

Падаўлене паўстання азначала пачатак другога этапу канфіскацыі маёнткаў. Так, пасля паражэння выступлення ў Дуброўне графства прыўлашчылі сабе Людвік і Казімір Пацеі, што было санкцыянавана на Гарадзенскім з'ездзе шляхты ВКЛ, а 30 кастрычніка 1701 г. адбыўся ўвод ва ўладанне [5, арк. 755]. Палова графства стала іх спадчынным ўладаннем, а другая была застаўлена за суму 1 207 000 злотых.

Пасля капітуляцыі Старога Быхава камандаванне гарнізонам фартэцыі, а потым і адміністрацыя графства пераходзяць да Казіміра Крыштапа Сяніцкага [17, с. 151]. Маючы таксама магілёўскую эканомію і будучы з 1703 г. генерал-маёрам войска ВКЛ, ён пачынае кантраляваць фактычна ўсё Падняпроўе.

Можна заўважыць пэўную карэляцыю паміж размахам рэспубліканскага руху ў тым ці іншым павеце і памерамі сапежынскіх уладанняў. Цікава тое, што найбольш зацятая барацьба паміж «рэспубліканцамі» і сапежынцамі ў кан. XVII ст. вялася менавіта ў тых паветах, дзе знаходзіліся асноўныя маёнткі Сапегаў. Можна, канешне, шмат што патлумачыць звычайнай зайздрасцю з боку шляхты і менш уплывовых магнатаў і маёмаснымі спрэчкамі, якія з гэтага вынікалі. Аднак былі і іншыя, не настолькі відавочныя, прычыны гэтай з'явы.

Палітычнае дамінаванне Сапегаў ў ВКЛ патрабавала немалых фінансавых выдаткаў. Гэта штурхала магнатаў закладаць свае маёнткі. Тут варта адзначыць, што Алькеніцкая пастанова прызнала за «дзяржаўцамі» сапежынскіх уладанняў усе іх правы і заключаныя кантракты [16, k. E]. Таксама гэтыя маёнткі вызваляліся ад кватаравання войска. Гэта наводзіць на думку, што сярод тых, каму закладаліся землі, далёка не ўсе былі даверанымі асобамі Сапегаў. Вядома, былі і такія – напрыклад, мсціслаўскі стольнік Ян Казімір Лендарф, якому Бенядзікт Павел Сапега заклаў Бобр з ліку чарэйскіх уладанняў

і якога пасля Алькенікаў мсціслаўская шляхта прызнала ворагам Айчыны. Але пры больш уважлівым разглядзе сярод трымальнікаў сапежынскіх уладанняў можна заўважыць групу асобаў, стаўленне якіх да «рэспубліканцаў» адпачатку было прыхільным. У якасці прыклада можна прывесці войскага полацкага Юрыя Глябіцкага Юзафовіча, які меў у заставе Сватошыцы і Гараны са складу дубровенскіх уладанняў. У 1701 г. дубровенскія паўстанцы спецыяльна наведаліся ў Сватошыцы з мэтай вызваліць мясцовых сялян ад паслушэнства Юзафовічу, а самога яго забіць. Яго жонка пры гэтым была абвінавачана ў дапамозе «рэспубліканцам» [5, 389–398 адв.]. 29 студзеня 1701 г. аршанскі павятовы палкоўнік Сімяон Друцкі Любецкі пісаў у лісце да полацкага харунжага Крыштапа Бенядзікта Неміровіча Шчыта, што Юрый Юзафовіч, хаця сам пад Алькенікамі і не быў, аднак ставіў пад яго харугву почт са сваіх уладанняў і выканаў у Оршы прысягу на вернасць Рэчы Паспалітай [18, арк. 710]. Іншы падобны прыклад – смаленскі стольнік Мікалай Шэмет, які трымаў у закладзе Нікадзімаў каля Гораў. Пасля Алькенікаў ён фігуруе, як актыўны удзельнік рэспубліканскага руху ў павеце, бярэ ўдзел амаль ва ўсіх сойміках, у 1701 і 1702 гг. абіраецца павятовым ротмістрам [5, арк. 834а, 1087].

**Заключэнне.** Перавага ў Аршанскім павеце буйнога магнацкага землеўладанне і адначасова наяўнасць значных дзяржаўных уладанняў, якія знаходзіліся ў трыманні магнатаў, не садзейнічала ўсталяванню тут палітычнай стабільнасці. Дамінаванне ў гэтай сферы аднаго магнацкага дому – Сапегаў – стымулявала ўзнікненне ў павеце моцнай рэспубліканскай групоўкі. Прычым удзел у рэспубліканскім руху брала нават частка трымальнікаў сапежынскіх уладанняў. Канфіскацыя у Сапегаў іх маёнткаў змяніла карэнным чынам расклад сіл у павеце. Пасля заканчэння грамадзянскай і Паўночнай вайны ў ВКЛ вяртанне і аднаўленне ўладанняў стане для Сапегаў галоўным напрамкам іх дзейнасці.

## Літаратура


1. Мелешко, В. И. Хозяйство крупных феодалов Восточной Белоруссии во второй половине XVII и в XVIII в.: дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / В. И. Мелешко – Мн., 1972. – 512 с.

2. Baranowski, I. Trzy hrabstwa białoruskie / I. Baranowski // Wieś i folwark. – Warszawa: Na-kładem księgarni W. Jakowickiego, 1914. – P. 257–272.

3. Rachuba, A. Hegemonia Sapiehów na Litwie jako przejaw skrajnej dominacii magnaterii w życiu kraju / A. Rachuba // Władza i prestiż. Mag-nateria Rzeczypospolitej w XVI–XVIII wieku / pod red. J. Urwanowicza. – Białystok: Wydaw-nictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2003. – P. 217–229.

4. Полное собрание русских летописей / отв. ред. Б. А. Рыбаков. – М.: Наука, 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / Н. Н. Улащик. – 1980. – 306 с.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) у г. Мінску. – Фонд 1731. – В. 1. – С. 2. Оршанский гродский суд. Актовая книга (1701–1702 гг.)

6. Dom Sapieżyński / oprac. E. Sapieha. – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 1995. – 805 p.

7. Sliesoriūnas, G. Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė vidaus karo išvakarėse: didikų grupuočių kova 1690–1697 metais. / G. Sliesoriūnas. – Vilnius: LII leidykla, 2000. – 342 p.

8. Rachuba, A. Ogiński Marcjan Aleksander / A. Rachuba // Polski Słownik Biograficzny. – Wrocław etc., 1978. – T. XXIII/3, z. 98. – P. 618–620.

9. Rachuba, A. Pociej Leonard Gabryel / A. Rachuba // Polski Słownik Biograficzny. – Wrocław etc., 1983. – T. XXVII/1, z. 112. – P. 35–37.

10. Sowa, A. Pociej Kazimierz Aleksander / A. Sowa // Polski Słownik Biograficzny. – Wrocław etc., 1982. – T. XXVII/1, z. 112. – P. 34–35.

11. Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD) w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów (AR). – Dz. II. – Teka 17 – nr 2364. Taryfa abiuratowa anni nonagesemi nayduiących się dymów ziemskich, stołowych (...) na seymiku relacynym (...) dozwolona. W Orszy die 15 marca 1717.

12. Metryka Litewska: Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo nowogródzkie 1690 r./ oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba; pod red. A. Rachuby; – Warszawa: Wydawnictwo NERITON, 2000. – 290 p.

13. Morzy, J. Kryzys demograficzny na Litwie i Białorusi w II połowie XVII wieku / J. Morzy – Poznań,1965. – 280 p.

14. Lesiński, J. Spora o dobra neuburskie / J. Lesiński // Miscellanea Historico-Archivistica. – 1996. – T. VI. – P. 95–132.

15. Niezabitowski, S. Dzienniki, 1695–1700 / oprac., przygotował do druku i wstępem opatrzył A. Sajkowski. – Poznań: Wydawnictwo naukowe UAM, 1998. – 375 p.

16. Postanowienie Generalne Stanów W. X. Lit. (...) pod Olkinikami uchwalone, [Wilno]: W Drukarni Akademiey Wileńskiey Soc. IHSV, 1700. – [38 k.].

17. Rachuba, A. Sienicki Krzysztof Kazimierz // Polski Słownik Biograficzny. – Warszawa – Kraków, 1996. – T. XXXVII/1, z. 152. – P. 151–153,

18. НГАБ. – Фонд 1734. – В. 1. – С. 5. Полоцкий гродский суд. Актовая книга (1701 г.)